**Вучэбная дысцыпліна «Стылістыка»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента навучання Модуль "Сучасная беларуская літаратурная мова – 4" |
| **Кароткі змест** | Асноўныя паняцці стылістыкі. Стыль як асноўная катэгорыя стылістыкі.Дыферэнцыяцыя функцыянальных стыляў. Характарыстыка функцыянальных стыляў сучаснай беларускай мовы. Стылістыка мовы і стылістыка маўлення. Асноўныя і перыферыйныя элементы структуры функцыянальнага стылю. Сістэмнасць функцыянальных стыляў.<br>Паняцце афіцыйна-дзелавога стылю. Паняцце навуковага стылю. Паняцце публістычнага стылю. Літаратурна-мастацкі стыль як асаблівая моўная катэгорыя, якая звязваецца з эстэтычнай функцыяй мовы. Гутарковы стыль. Эмацыянальна-экспрэсіўныя тыпы лексікі. Стылістычнае значэнне, стылістычныя сродкі мовы. Узаемадзеянне і ўаемапранікненне стыляў. Стылістыка тэксту. Стылістычнае выкарыстанне назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў. Метады стылістычнага аналізу тэкстаў. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:** гісторыю развіцця і фарміравання нормаў і стыляў беларускай мовы; развіццё і станаўленне функцыянальных стыляў сучаснай беларускай літаратурнай мовы; класіфікацыю камунікатыўных якасцей сучаснай беларускай мовы; агульныя і спецыяльныя сродкі выяўленчай выразнасці маўлення; **умець:** выкарыстоўваць форму, змест і функцыю моўнай адзінкі, вызначаць тоеснасць яе з іншымі адзінкамі мовы;прымяняць веды аб будове маўленчай сітуацыі; правільна будаваць тэкст любога стылю і тыпу; валодаць сродкамі тэхнічнай выразнасці пісьмовага маўлення.<br>Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне кампетэнцый:<br>**БПК-17** – улічваць стылістычны патэнцыял фанетычных, лексічных, граматычных, дыскурсіўна-тэкставых парадыгм беларускай мовы, яго функцыянальна-стылістычныя і стылёвыя разнавіднасці. |
| **Прэрэквізіты** | Сучасная беларуская мова, рыторыка, культура маўлення |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне – 90 (3 заліковыя адзінкі). Колькасць аўдыторных гадзін – 48, з іх лекцыйных – 24, практычных – 24. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 5 семестр, тэставыя заданні, залік. |